Источник: "Навука" - 2025-04-08

# АКАДЭМІЧНЫЯ ЧЫТАННІ

**У Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі прайшлі Акадэмічныя чытанні, прымеркаваныя да 500-годдзя з дня выдання кнігі «Апостал» першадрукара Францыска Скарыны. У мерапрыемстве прынялі ўдзел вядучыя беларускія даследчыкі ў галіне гісторыі, літаратуразнаўства, мовазнаўства і кнігазнаўства.**

Як адзначыў дырэктар Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы Іван Саверчанка, «Апостал» – гэта вяршыннае выданне Францыска Скарыны, якое падсумоўвае яго дзейнасць. «Кніга «Апостал» выйшла ў 1525 годзе ў Вільні. Гэта вельмі важная падзея, – сказаў вучоны. – І мы вырашылі правесці Акадэмічныя чытанні, каб яшчэ раз усебакова асэнсаваць творчую спадчыну Францыска Скарыны, яго ўклад у наша кнігадрукаванне, літаратуру, філасофію, культуру, вершаскладанне, інтэлектуальную думку. Бо гэта быў чалавек-энцыклапедыя. Ён першы з беларускіх навукоўцаў і творчых людзей меў ступень доктара медыцыны.

Апроч таго, Скарына захапляўся філалогіяй і зрабіў пераклады на беларускую мову многіх кніг, напісаў да іх выдатныя прадмовы, якія з'яўляюцца бліскучымі літаратурнымі творамі. Аднак яны сінтэтычныя, у іх знайшлося месца і для яго філасофскай думкі, і для яго сацыяльнай этычнай дактрыны, і для сістэмы каштоўнасцей грамадства. Там жа ён разважае пра ролю права, гаворыць пра ўдасканаленне судовай сістэмы краіны, бо мы ведаем, што Францыск Скарына, паводле некаторых меркаванняў, мог прымаць удзел у падрыхтоўцы першага Статута ВКЛ 1529 года. Гэта быў чалавек, які працаваў для народа, краіны, дзяржавы. Аднак перш за ўсё місія Скарыны была асветніцкай. Ён далёка апярэджваў час, і можна толькі здзіўляцца, наколькі яго ідэі аб сацыяльным міры, грамадскай гармоніі, міжканфесійным узаемаразуменні надзвычай актуальныя і сёння».

На форуме прагучалі даклады, прысвечаныя жыццю і дзейнасці беларускага першадрукара. Загадчык аддзела гісторыі Беларусі IX–XVIII стагоддзяў і археаграфіі Інстытута гісторыі Аляксандр Доўнар расказаў пра Полацк пачатку XVI ст. – радзіму Францыска Скарыны. Старшы навуковы супрацоўнік аддзела даследавання рукапісаў ЦНБ НАН Беларусі Мікалай Трус выступіў з дакладам «Скарыніяна першай паловы XX ст.. архіўны дыскурс». Навуковы супрацоўнік аддзела кнігазнаўства ЦНБ НАН Беларусі Вольга Губанава расказала пра кнігу «Апостал» і больш позні яе выданні на славянскай прасторы XVI–XVII стст. На пытаннях мовы выданняў першадрукара спынілася вядучы навуковы супрацоўнік аддзела гісторыі беларускай мовы Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа Ірына Будзько.




Дарэчы, у холе шостага паверха была арганізавана кніжная выстава, прысвечаная вывучэнню творчай спадчыны Францыска Скарыны.

Алена ГАРДЗЕЙ
Фота аўтара, «Навука»

Алена Гардзей. Акадэмічныя чытанні